Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

ОРГАН партбюро, камітэта ЛКСМБ, прафкома, МК і рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта

№ 13 (107) | 2 верасня 1940 г. | Год выдання VI

ВУЧЭБНЫ ГОД ПАЧАЎСЯ
ЗА РАБОТУ, тт. СТУДЭНТЫ і НАВУКОВЫЯ РАБОТНІКІ!

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫКАНАННЕ УКАЗА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Скончыліся канікулы студэнтаў і адпачынкі навуковых работнікаў універсітэта. Выдатна адпачыўшы, з новымі сіламі універсітэцкая моладзь і навуковыя работнікі прыступаюць сёння да творчай работы ў новым вучэбным годзе.

У аўдыторыях, кабінетах, лабараторыях пачалася кіпучая работа. Сюды ўпершыню прышлі выпускнікі сярэдняй школы—новае папаўненне універсітэта, радасна спатканае студэнтамі старэйшых курсаў і калектывам навуковых работнікаў.

Універсітэту ў цэлым, студэнтам і навуковым работнікам у прыватнасці, прадстаіць вялікая работа па выкананню вучэбнага плана і з'яднанню такога калектыва, які мог-бы з поспехам выканаць задачы, пастаўленыя партыяй і ўрадам перад вышэйшай школай і, у прыватнасці, перад нашым універсітэтам, якому прадстаіць падрыхтаваць усебакова граматных людзей, адданых справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Такая асноўная задача студэнтаў, навуковых работнікаў, грамадскіх арганізацый і рэктарыята універсітэта. Гэту задачу мы зможам выканаць пры ўмове чоткага і няўхільнага выканання Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня г. г.

Пярвейшы абавязак кожнага студэнта і навуковага работніка штодзённа ўмацоўваць працоўную дысцыпліну, рашуча змагацца з гультаямі, прагульшчыкамі і іншымі дэзарганізатарамі вучэбнага працэса. З парушальнікамі працоўнай дысцыпліны павінны весці жорсткую барацьбу не толькі судовыя органы і адміністрацыя, але і ўся грамадскасць. Ад нас гэтага патрабуюць партыя і ўрад.

У гэтым вучэбным годзе неабходна добра арганізаваць улік наведвання лекцый студэнтамі, а староста, якія нядобрасумленна адзначаюць яўку студэнтаў на лекцыі, пакіданне іх і т. д., трэба прыцягваць да стражайшай адказнасці, як людзей, патураючых прагульшчыкам і садзейнічаючых ім тварыць антынародныя справы.

Неабходна зразумець, што выкананне Указа не ёсць кампанія, якую можна «правярнуць». Поспех выканання Указа залежыць ад таго, наколькі мы зможам арганізаваць сістэматычнае раз'яснение студэнтам і навуковым работнікам значэнне Указа, накіраванага на паляпшэнне ўсёй работы прадпрыемстваў, устаноў, на павышэнне прадукцыйнасці працы, умацаванне магутнасці соцыялістычнай радзімы.

У адрозненне ад мінулых год, у гэтым годзе дэканаты павінны пастроіць расклады лекцый такім парадкам, каб не было выпадкаў зрыву лекцый з-за путаніцы ў раскладах.

Практыка мінулых год, калі асобныя навуковыя работнікі нярэдка лічылі дапусцімым прыходзіць на лекцыі са спазненнем на 5—10 мінут і пакідаць лекцыі за 15—20 мінут, бясспрэчна, павінна разглядацца як парушэнне працоўнай дысцыпліны. Такія выпадкі трэба рашуча прасякаць з усёй строгасцю закона.

Выключную ролю ў справе ўмацавання дысцыпліны адыгрывае дэкан факультэта, які павінен мець на ўвазе, што факультэтам ён кіруе як адзіначальнік. Усё-ж грамадскія арганізацыі павінны садзейнічаць падняццю аўтарытэта дэкана, сістэматычна памагаючы яму ўмацоўваць жалезную дысцыпліну, што ў канчатковым выніку павінна палепшыць увесь вучэбны працэс, падняць якасць вучобы і ўсёй работы факультэта.

Вучэбны план 1940/41 вучэбнага года можа быць з поспехам выкананы таксама пры ўмове, калі з першых дзён кожны студэнт, навуковы работнік возьмецца па-большэвіцку за вучобу, за работу, актыўна ўключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва. Партыйныя і грамадскія арганізацыі павінны узначаліць кіраўніцтва соцспаборніцтвам, барацьбу за якасць вучобы, за рашучае ўмацаванне дысцыпліны як вучэбнай, так і грамадскай, барацьбу за сталінскія стыпендыі.

Студэнты-першакурснікі не маюць яшчэ вопыту самастойнай работы. Таму яны павінны атрымаць з першых дзён вучобы указанні і дапамогу ад выкладчыкаў і студэнтаў старэйшых курсаў, асабліва ў справе самастойнай работы над кнігай, запісу лекцый выкладчыкаў і інш.

Пленум ЦК ВКП(б) прадаставіў права партыйным арганізацыям кантраляваць выкананне і правядзенне ў жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня г.г. Гэтае права павінна быць поўнасцю скарыстана нашай універсітэцкай партыйнай арганізацыяй. Кожны камуніст і комсамолец павінен быць прыкладам дысцыплінаванасці. Не можа быць месца ў нашых радах ліберальным адносінам да прагульшчыкаў і дэзарганізатараў вучэбнага працэса.

УМАЦАВАЦЬ ПРАЦОЎНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ

З часу апублікавання Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, семідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў прайшло больш двух месяцаў. За гэты час значна ўмацавалася працоўная дысцыпліна сярод навуковых і адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў.

Выпадкаў парушэння дысцыпліны зараз налічваецца мала, але яны красамоўна гавораць аб тым, што працоўная дысцыпліна яшчэ не на належнай вышыні. У нас ёсць, з дазволу сказаць, такія работнікі, якія сваёй працоўнай распушчанасцю, прагуламі і спазненнямі наносяць шкоду дзяржаве.

Маладая дзяўчына сакратар завочнага сектара універсітэта тав. Чудзіновіч абыякава адносілася да даручанай справы, а 9 лістапада спазнілася на 30 мінут на работу. Дэзарганізатар працоўнай дысцыпліны была аддана пад суд. Суд прыгаварыў яе да двух месяцаў папраўча-працоўных работ з адлічэннем 15% зарплаты. Асуджаны таксама за прагулы: на 6 месяцаў швейцар Лазоўскі і на 4 месяцы швейцар Руды. Лабарантка Кажарская, нясвоечасова прыступіўшая да работы пасля чарговага адпачынку, таксама аддана пад суд.

Не ўсё яшчэ ў парадку з працоўнай дысцыплінай сярод прафесарска-выкладчыцкага састава. Не зніжчаны канчаткова спазненні на 5—7 мінут асобнымі лектарамі. У гэтым вінаваты ў значнай меры дэканаты, якія «на-хаду» перарабляюць расклады, не паведамляючы аб гэтым своечасова выкладчыкаў. З першых дзён вучобы патрэбна з гэтым павесці рашучую барацьбу.

Совецкая дысцыпліна працы патрабуе, каб кожны работнік, незалежна ад таго кім і дзе ён працуе, поўнасцю і прадукцыйна загружаў свой рабочы дзень, аддана працаваў на даручаным яму пасту.

Табельшчыца ФРЫДМАН.

ВУЧЫЦЦА ВЫДАТНА

10 год, праведзеных ў сярэдняй школе, назаўсёды астануцца добрым, светлым успамінам у жыцці. За гэтыя годы мацна здружыліся вучні паміж сабой, палюбілі педагогаў.

На выпускным вечары цёпла расставаліся з намі, са сваімі выхаванцамі, настаўнікі, школа. Педагогі давалі наказ, дзе-б мы ні знаходзіліся—ці ў Чырвонай Арміі, ці ў вышэйшай навучальнай установе, ці на вытворчасці, каб не заплямілі чэсці школы.

Я рашыла прадаўжаць вучобу ва універсітэце. Выбрала філалагічны факультэт, бо літаратура, мова і гісторыя былі маімі любімейшымі прадметамі ў школе. Прыёмныя іспыты здала я нядрэнна. З сямі прадметаў, здаваемых на экзаменах, па шасці атрымала выдатныя адзнакі і па аднаму добра. Гэтым я абавязана сваім педагогам, даўшым мне глыбокія веды.

Пачынаючы вучобу ў вышэйшай школе, я рашыла вучыцца толькі на выдатна. Выдатная вучоба будзе лепшай падзякай за клопаты аб нас радзімы, даўшай моладзі вялікае права — права на асвету.

Т. ФРЫДМАН.

Студэнтка 1 курса філфака, выпускніца сярэдняй школы ім. Кірава г. Мінска.

ВЯЛІКАЯ ПАДЗЕЯ

Сёння ў мяне незвычайная радасць: разам з вясёлай, жыццерадаснай моладдзю я пачынаю вучобу ва універсітэце. Гэта вялікая падзея ў маім жыцці.

Нам, маладым грамадзянам Совецкай краіны, адкрыты ўсе шляхі і дарогі да светлага і радаснага жыцця. Партыя, урад, любімы Сталін стварылі нам усе ўмовы для плённай працы і вучобы. Прастбрныя, светлыя аўдыторыі, багатыя і складаныя лабараторыі і кабінеты, бібліятэкі, прафесарска-выкладчыцкі састаў, нарэшце, бясплатнае навучанне з прадастаўленнем дзяржаўнай стыпендыі — усё гэта здабытак кожнага з нас.

Мы, першакурснікі, бязмежна рады паступленню ў вышэйшую навучальную ўстанову. Вучобай ва універсітэце пастараемся апраўдаць клопаты і надзеі радзімы.

Я паступіў на хімічны факультэт. Паступіў таму, што навука хіміі яшчэ з маленства прыцягвала да сябе. Яна была для мяне любімейшым прадметам ў сярэдняй школе, я яе настойліва вывучаў. Пры паступленні ва універсітэт я здаў гэты прадмет на выдатна.

Тут, ва універсітэце, прадстаіць старанная работа, глыбокае і дэтальнае вывучэнне гэтай адной з складанейшых навук. Каб стаць добрым, поўнацэнным спецыялістам-хімікам, патрэбна старанна працаваць над сабой. Так я і мяркую—годы вучобы прадукцыйна загрузіць работай над сабой.

Л. М. МІРКІН.

Студэнт I курса хімфака.

ПОЎНАСЦЮ ВЫКАНАЦЬ ВУЧЭБНЫ ПЛАН

К канцу мінулага вучэбнага года гістарычны факультэт універсітэта прышоў з даволі добрымі паказчыкамі ў сваёй рабоце. Гадавы вучэбны план выканан быў па факультэту на 98 проц. Акадэмічная паспяховасць студэнтаў за абедзве экзаменацыйныя сесіі выражаецца ў наступных лічбах: выдатныя адзнакі складаюць 34,3 проц., добрыя—32,2 проц., пасрэдныя—31,7 проц., дрэнныя—1,8 проц. Параўнальна з мінулым годам паспяховасць павысілася.

Добрую падрыхтоўку паказалі студэнты-выпускнікі.

Значна палепшылася работа кафедр асабліва ў галіне навукова-даследчай работы. Навуковыя работнікі факультэта прымалі актыўны ўдзел у навуковых сесіях універсітэта, падрукавалі рад сваіх работ у мясцовых і цэнтральных выданнях.

Побач з гэтымі поспехамі ў рабоце гістарычнага факультэта ёсць рад істотных недахопаў. Да ліку іх трэба аднесці ў першую чаргу вялікую колькасць прагулаў лекцый студэнтамі па няўважлівых прычынах. Кафедры ўсё яшчэ недастаткова разгарнулі сваю навукова-даследчую работу: няма яшчэ сістэматычнай праверкі якасці выкладання; не поўнасцю скарыстоўваюцца маючыяся ў распараджэнні факультэта наглядныя дапаможнікі, вяла працякала работа студэнцкага навукова-даследчага гуртка. Марудна ў асобных выпадках ідзе падрыхтоўка дысертацый і т. д.

У пачынаючымся вучэбным годзе гістарычны факультэт павінен дабіцца далейшага палепшання якасці сваёй работы. Неабходна поўнасцю выканаць вучэбны план. У вучэбны план 1940—41 навучальнага года ўключана рад новых курсаў, аднаўляецца выкладанне гісторыі Беларусі і палітычнай эканоміі. Кафедры факультэта абавязаны забяспечыць высокаякаснае правядзенне гэтых курсаў. Неабходна шырэй разгарнуць навукова-даследчую работу. Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на работу двух старэйшых курсаў, асабліва па кіраўніцтву педпрактыкай, курсавымі работамі і спецсемінарамі. Трэба дабіцца глыбокага вывучэння студэнтамі асноў марксізма-ленінізма.

Самастойнай рабоце студэнтаў павінна быць аддана належная ўвага як з боку кафедр, так і ўсяго прафесарска-выкладчыцкага састава. У мінулым годзе студэнты-гісторыкі атрымалі рад добрых падручнікаў па асноўных прадметах свайго вучэбнага плана, аднак у час экзаменацыйнай сесіі можна было заўважыць, што не ўсе студэнты дастаткова скарысталі гэтыя дапаможнікі ў працэсе падрыхтоўкі да экзаменаў. Усё яшчэ ёсць студэнты, якія здаюць той ці іншы экзамен толькі па канспекту. З гэтым патрэбна пакончыць. Лепшым сродкам папярэджання такіх выпадкаў з'яўляецца сістэматычнае правядзенне кансультацый і калеквіумаў.

Асобую ўвагу патрэбна звярнуць на вывучэнне замежных моў. Да гэтага часу ў некаторых студэнтаў мелася недаацэнка гэтых прадметаў. Вывучэнне замежных моў лічыцца чамусьці справай лішняй і непатрэбнай.

З першага-ж дня вучобы патрэбна ўстанавіць цвёрдую працоўную дысцыпліну, аб'явіць рашучую барацьбу прагульшчыкам і парушальнікам працоўнай дысцыпліны і парадку. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета ад 26 чэрвеня абавязвае ўсіх нас з усёй рашучасцю ўзяцца за падняцце дысцыпліны ў групе, на курсе, на кафедры і на факультэце.

А. П. ПЬЯНКОЎ.

Дэкан гістарычнага факультэта.

На здымку: Хімічны корпус БДУ.

НЕКРОЛАГ

25 жніўня памёрла Надзежда Афанасьеўна Пракапчук, дацэнт кафедры арганічнай хіміі, кандыдат хімічных навук.

Надзежда Афанасьеўна была адным з старэйшых работнікаў універсітэта, была яго выхаванцам. Пасля заканчэння аспірантуры, з 1930 года яна працавала па кафедры арганічнай хіміі, выконваючы рознастайную педагагічную і навуковую работу. На ўсёй гэтай рабоце ляжаў адбітак удумлівасці, стараннага выканання. Гэтыя якасці ў рабоце далі магчымасць Надзеждзе Афанасьеўне хутка развіцца ў кваліфікаванага навуковага работніка і вопытнага педагога, якому даручалася звычайна найбольш адказная работа.

Ужо будучы зусім хворай, лежачы ў пасцелі, яна не пакідала думкі аб сваёй рабоце ва універсітэце, абдумвала, як гэту работу палепшыць у надыходзячым вучэбным годзе, рыхтавалася да яе сама і напамінала аб гэтым сваім таварышам па рабоце. Яе мучыла думка аб пакіданні на поўдарогі даследчай работы і яна імкнулася і марыла аб дні, калі зможа яе аднавіць.

На вялікі жаль, гэтым марам не суджана было ажыццявіцца. Надзежда Афанасьеўна памерла нсяк раптоўна, нечакана, пакінуўшы ва ўсіх нас горач заўчаснай утраты і самы цёплы ўспамін аб сабе, як аб скромным, чэсным работніку і добрым таварышу.

Група таварышоў.

ВОСЬ ТАК СУСТРЭЧА

Стрэлка гадзінніка паказала 11 вечара, калі поезд спыніўся на станцыі.

— Вось, нарэшце, і доўгачаканы Мінск. Прыехаў, выходзячы з вагона з палёгкай ўздыхнуў студэнт Іван. Ён быў па-летняму апранут, у руцэ трымаў даволі цяжкі чамадан. «Начаваць прыдзецца ісці ў мінулагодні інтэрнат,—вырашыў ён, накіроўваючыся на Студэнцкую вуліцу.

Вячэрні халадок пачаў сціскаць плечы. Іван прыбавіў кроку.

Неўзабаве паказаліся студэнцкія баракі. У вокнах цёмна. «Няўжо-ж нікога не будзе ў нашым 54?»—з трывогай падумаў ён, набліжаючыся да мэты.

Так і ёсць: цёмна і тут. Але вяртацца назад было нельга, і ён павольна падышоў да ўваходу. Дзверы адчынілі. На голас нехта сонным голасам адгукнуўся.

— Мне патрэбна дзе-небудзь пераначаваць, я...

— Але-ж тут начаваць нельга. У нас яшчэ не прыбрана, на карыдоры вазоны стаяць, схадзіце у 35,—соладка пазяхаючы параіў швейцар.

— Добра, зайду ў 35, згадзіўся студэнт. Пайшоў дождж, і ён вымушан быў хуценька прабегчы ў суседні барак.

— Нічога не будзе... Мне камендант загадаў без яго ведама нікога не пускаць, —спакойным голасам адказаў швейцар на просьбу Івана.

— Ды як-жа так? Дзе-ж я цяпер знайду каменданта? На вуліцы дождж ідзе, ды ўжо 12 гадзін часу...

— Гэта не мая справа. Дайце мне даведку, што вы не хворыя, тады я дазволю пераначаваць. Мне так загадана.

— Але-ж у такі позні час ніякай даведкі дастаць нельга, я гэта зраблю заўтра,—не адставаў студэнт.

— Гэта—не мая справа. Камендант сказаў «няхай хоць памірае, але не пускай».

... Такі лес спаткаў студэнтаў, прыехаўшых на заняткі,

Заняткі пачаліся, а інтэрнаты і на сёння поўнасцю не прыгатаваны да прыёму студэнтаў. Вечарам, у выпадку ад адсутнасці электрычнага святла, у інтэрнатах цёмна. Няма керасінавых ламп, гасінаў, чайнікаў.

— Дзе-ж можна памыцца?—пытаемся мы аднойчы раніцой у тэхпрацаўніцы.

— Найдзіце каменданта, вазьміце ў яго чайнік, вазьміце вады і мыйцеся.

— А дзе камендант?—зноў запытваем мы.

— Я не ведаю, дзе ён жыве,—адказала тэхнічка, а потым, падумаўшы, сурёзна дадала:—Схадзіце ў Адраснае бюро, там і даведаецеся.

І гэта ўсё для таго, каб... памыцца.

Колькасць крэслаў чамусці вельмі абмежавана—два на пакой. Тумбачкі ляжаць на дварэ, яшчэ толькі рамантуюцца. Не ў час пафарбаваная падлога не высахла, яна пакідае на сабе адбіткі слядоў. Няма радыё.

К.

Сур'ёзная і глыбокая праверка

Рашэннем ЦК ВЛКСМ з 1 верасня па 1 кастрычніка праводзяцца выбары кіруючых камсамольскіх органаў.

Выбары кіруючых камсамольскіх органаў — глыбокая і сур'ёзная праверка ўсіх звенняў камсамольскай работы. У жыцці ленінска-сталінскага камсамола гэта падзея агромнай палітычнай важнасці. Выбары, як у люстры, пакажуць боегодольнасць, палітычную зрэласць кожнай камсамольскай арганізацыі, памогуць падняць камсамольскую работу на новую, больш высокую ступень, адпавядаючую ўзросшым патрабаванням к камсамолу.

У барацьбе за выкананне рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) нязмерна выраслі роля і аўтарытэт камсамола. Камсамол стаў больш актыўна ўдзельнічаць у дзяржаўнай і гаспадарчай рабоце, змагацца за ахову сацыялістычнай уласнасці, за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны. Рашэнні XI пленума ЦК ВЛКСМ знамянуюць сабой карэнную перабудову камсамольскай работы. Гэтыя рашэнні — праграма баявых дзеянняў усіх камсамольскіх арганізацый. У актыўнае саюзнае жыццё ўключаюцца новыя, маладыя актывісты, якія з вялікім стараннем выконваюць даручэнні арганізацый. Трэба усяляк развіваць і стымуляваць ініцыятыву радавых членаў камсамола, рознымі формамі і метадамі прыцягнуць іх да работы ў камсамольскай арганізацыі.

Да выбараў астаўся адзін дзень. Кожная камсамольская арганізацыя групы, факультэта павінна ўсебакова і глыбока праверыць сваю работу, паглядзець як выконваюць камсамольцы свае абавязкі, становішча камсамольскай арганізацыі, уплату членскіх узносаў і т. д.

Наша вытворчасць — гэта вучоба. На справаздачна-выбарных сходах трэба прыдаць сур'ёзную ўвагу пытанню вучобы камсамольцаў і ўсіх студэнтаў універсітэта, удзелу іх у навукова-даследчай рабоце. Неабходна паказаць, як студэнты, і ў асаблівасці камсамольцы, авалодваюць асновай усіх навук — марксізмам-ленінізмам.

Справаздачныя сходы павінны таксама адлюстраваць барацьбу камсамольскай арганізацыі за ўмацаванне дысцыпліны, пастаноўку палітычна-масавай і ваенна-фізкультурнай работы.

Выбары ў камсамольскія арганізацыі універсітэта пачнуцца з камсамольскіх груп; затым будуць праходзіць факультэцкія сходы, а 9 і 10 верасня адбудзецца універсітэцкая камсамольская канферэнцыя.

Крытыка камсамольцаў і камсамольскіх кіраўнікоў, практычныя советы і прапановы моладзі — усё павінна быць накіравана на ўзорнае правядзенне выбараў, на далейшае паляпшанне камсамольскай работы.

«Надыходзячыя выбары кіруючых камсамольскіх органаў, — гаворыцца ў пастанове ЦК ВЛКСМ, — павінны быць праведзены пад знакам далейшага павышэння мабілізацыйнай гатоўнасці камсамола і ўсёй моладзі, праверкі выканання камсамольскімі арганізацыямі рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б), мабілізацыі камсамольцаў на больш актыўны ўдзел у дзяржаўным і гаспадарчым будаўніцтве, на барацьбу за далейшае павышэнне прадукцыйнасці працы і ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, на павышэнне большэвіцкай пільнасці».

А. БЕЙЛІНСОН,
сакратар камсамольскага камітэта ЛКСМБ.

ВЫНІКІ МІНУЛАГА І ЗАДАЧЫ БЯГУЧАГА ВУЧЭБНАГА ГОДА

У выніку штодзённых клопатаў партыі і ўрада аб вышэйшай школе Беларускі Дзяржаўны Універсітэт за мінулы год атрымаў нямала новых стымулаў для далейшага павышэння якасці сваёй работы. Гэта, па-першае, устанаўленне сталінскіх стыпендый, павысіўшыя творчую актыўнасць студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага складу. Па-другое, гэта рашэнне ЦК ВКП(б), асудзіўшае скажэнні ў спаборніцтве ВПУ і факты лібералізма ў адносінах. Гэта рашэнне павысіла адказнасць студэнтаў за вучобу, а прафесарска-выкладчыцкага персанала — за якасць выкладання.

Нарэшце, у гэтым годзе вышэйшая школа своечасова атрымала ад Усесаюзнага камітэта і Наркомасветы праграмы і вучэбныя планы; атрымана таксама значная колькасць падручнікаў.

Усё гэта дало магчымасць нашаму універсітэту значна палепшыць сваю работу на працягу мінулага вучэбнага года. Вучэбны план універсітэта выканан на 99,7 проц.

На веснавой экзаменацыйнай сесіі значна павысілася паспяховасць: выдатна атрымала 30,2 проц., добра — 35,8 проц., пасрэдна — 30,3 проц., дрэнна— 3,5 проц. Такім чынам, добрыя і выдатныя адзнакі складаюць 66 проц.

Дзяржаўныя экзамены, не гледзячы на тое, што яны праходзілі сёлета ў своеасаблівай, я сказаў-бы ускладненай абстаноўцы, у сувязі з працягламі педпрактыкай, прайшлі арганізавана і далі зусім здавальняючыя вынікі. З усёй колькасці студэнтаў пятых курсаў з'явілася на дзяржаўныя экзамены 98,7 проц., даўшы наступныя паказчыкі паспяховасці: выдатна — 29,6 проц., добра — 30,8 проц., пасрэдна — 37,4 проц., дрэнна — 2,2 проц.

У прыватнасці, мінулы год з'явіўся таксама годам палепшання работы кафедры асноў марксізма-ленінізма ў справе выкладання марксісцка-ленінскай тэорыі.

У рэзультаце мерапрыемстваў рэктарыята павысіліся веды студэнтаў па рускай мове. Калі праведзеная ў верасні лыктоўка дала агульную паспяховасць 55 проц., то за першы семестр паспяховасць складала 87 проц., а за другі семестр — 94 проц.

Аднак, пералічаныя поспехі не павінны адцягваць нашай увагі ад таго, што і ў мінулым годзе ў нашай рабоце меў месца рад сур'ёзных недахопаў. К гэтым недахопам у першую чаргу патрэбна аднесці нездавальняючае становішча працоўнай дысцыпліны. Вялікая колькасць студэнтаў мела пропускі заняткаў, былі факты парушэння дысцыпліны на лекцыях, семінарскіх і практычных заняткаў.

Другім недахопам была наяўнасць вялікай колькасці студэнтаў, маючых акадэмічную запазычанасць. Усяго па універсітэту мела запазычанасць 307 чал., што складала 25 проц. да агульнай колькасці студэнтаў. З гэтага ліку 18 студэнтаў, меўшых запазычанасць па чатырох і больш прадметах, адлічаны за непаспяховасць. З рэшты 26 чал. пакінута на паўторны курс без стыпендыі і 263 чал. — пераведзена на наступныя курсы ўмоўна.

Трэцім недахопам з'яўляецца тое, што значная колькасць студэнтаў усё яшчэ малаграматна, з неглыбокімі, павярхоўнымі ведамі, асабліва па гуманітарных навуках.

У галіне навукова-даследчай работы асноўным недахопам з'яўляецца невыкананне радам кафедр планаў навукова-даследчай работы, у выніку чаго тэмы пераносяцца з году ў год і адцягваецца іх сканчэнне.

Неабходна, улічыўшы памылкі і недахопы мінулага вучэбнага года, арганізаваць вучэбны працэс і ўсю работу універсітэта так, каб кожны факультэт, кожная кафедра, кожная студэнцкая група працавалі чотка, зладжана і бесперабойна. Кожны дэкан і загадчык кафедры павінен памятаць, што работа на факультэце будзе пастаўлена **добра толькі тады,** калі кафедра зробіцца кіруючым і арганізуючым цэнтрам навуковай і вучэбнай работы. А роля кафедры дзе-нідзе дагэтуль яшчэ недаацэньвалася.

Для карэннага паляпшання работы патрэбен перш за ўсё цвёрды, устойлівы распарадак у арганізацыі вучэбнага працэса і найстражэйшая дысцыпліна. У наладжванні чоткай работы вялікую ролю адыгрывае прадуманы расклад, які не падпадаў-бы на працягу семестра ніякім зменам.

Ад навукова-выкладчыцкага састава і студэнцтва мы ў гэтым годзе, у адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, патрабуем строгага захавання распарадку навуковых заняткаў.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР з'яўляецца каштоўнейшай зброяй непрымірымай барацьбы з прагульшчыкамі. Ва універсітэце не павінна быць ніводнага пропуску і спазнення на заняткі і на работу, не павінна быць ніводнага парушэння дысцыпліны на занятках.

Грамадскія арганізацыі павінны аказаць вялікую дапамогу ў наладжванні працоўнай дысцыпліны, у правядзенні рашучай барацьбы з гультаямі і прагульшчыкамі.

Поспех вучэбнай работы значна залежыць ад якасці лекцый, практычных заняткаў і семінараў. Якасць-жа залежыць ад таго, як выкладчык рыхтуецца да заняткаў. Тыя прафесары і выкладчыкі, якія старанна рыхтуюцца да лекцый, як акад. Перцаў, акад. Годнеў, праф. Асіпенка, праф. Смірноў, дац. Сагаловіч і інш., даюць студэнтам глыбокія і грунтоўныя веды. Такія лекцыі прыкоўваюць да сябе ўвагу слухачоў і цэняцца імі.

Рэктарыяту, навучальнай часткі, дэканам і загадчыкам кафедр неабходна ўдзяліць больш увагі кантролю за чытаннем лекцый, аказваць дапамогу выкладчыкам у паляпшанні якасці лекцый.

Другім важнейшым элементам высокай якасці вучобы з'яўляецца сістэматычная самастойная работа студэнтаў над падручнікам і літаратурай. Практыка паказала, што рад студэнтаў, асабліва першых курсаў, у першы час вучобы не працуюць самастойна, адкладваюць гэту работу на перыяд падрыхтоўкі да экзаменацыйнай сесіі, а потым аказваюцца не ў стане падрыхтавацца па падручніку і «зубрацъ» па запісах лекцый, пры тым гэтыя запісы не заўсёды здавальняючыя.

Вялікае значэнне для якасці вучобы мае агульнае развіццё студэнта, яго палітычны кругазор, які можа быць на патрэбным узроўні толькі тады, калі студэнт сістэматычна чытае газеты, мастацкую і палітычную літаратуру. Прафесарска-выкладчыцкі састаў і асабліва выкладчыкі мовы і літаратуры, павінны сістэматычна культывіраваць у студэнтаў любоў да чытання мастацкай і палітычнай літаратуры. Бібліятэка павінна лепш паставіць справу папулярызацыі сярод студэнтаў лепшых твораў сучасных пісьменнікаў і класікаў мастацкай літаратуры.

П. САВІЦКІ,
рэктар універсітэта.

Мінск, друкарня «Звязды». УК1490

Адказны рэдактар І. М. ЛЕВІН.